ПРАЛЕТАРЫІ УСЯЁ КРАІНЫ, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 252 (324) | Субота 2 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні бурат-мангольскага Дзяржаўнага Музыкальна-Драматычнага тэатра ордэнам Леніна

За выдатныя поспехі ў справе развіцця бурат-мангольскага музыкальна-драматычнага мастацтва ўзнагародзіць бурат-мангольскі Дзяржаўны Музыкальна-Драматычны тэатр ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 31 кастрычніка 1940 года

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб прысваенні звання народнага артыста СССР народнаму артысту Бурат-Мангольскай АССР Цыдэнжапаву Г. Ц.

За выдатныя заслугі ў развіцці тэатральнай і музыкальнай культуры прысвоіць званне народнага артыста СССР Цыдэнжапаву Гамбо Цыдэнжапавічу — народнаму артысту Бурат-Мангольскай АССР, мастацкаму кіраўніку бурат-мангольскага Музыкальна-Драматычнага тэатра.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 31 кастрычніка 1940 года

Выбарчы ўчастак — цэнтр агітацыйнай і арганізацыйнай работы

Усё шырэй разгортваецца выбарчая кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Праведзеныя сходы на прадпрыемствах, у калгасах, вёсках, установах прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі вылліся ў магутную дэманстрацыю несакрушальнай сілы сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, любві і адданасці працоўных заходніх абласцей Беларусі да вялікай партыі Леніна-Сталіна, совецкага ўрада, да сваёй прыгожай радзімы.

Вызвалены народ перажывае вялікую радасць выкліканую правядзеннем выбарчай кампаніі і падрыхтоўкай да ўсенароднага свята — XXIII гадавіны Кастрычніцкай Социялістычнай революцыі. Множацца поспехі перадкастрычніцкага социялістычнага спаборніцтва, растуць рады стахановаў. Рабочы калектыў завода „Грудкі", Гайнаўскага раёна, у адзнаку свята Кастрычніка выканаў гадавую вытворчую праграму. Пераважная большасць рабочых паказвае высокія ўзоры стахановскай работы. Прадукцыйнасць працы тут павялічылася на 146 процантаў, што дало магчымасць выпусціць прадукцыі звыш плана на 417.500 рублёў. У часць выбарчай кампаніі да канца года рабочыя абавязаліся распілаваць 18 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу.

Усюды новымі вытворчымі перамогамі сустракаюць працоўныя свята Кастрычніка і правядзенне выбарчай кампаніі. Машыністы паравознага дэпо Брэста Гарбуноў, Сайчанка і другія паказваюць узоры вядзення цяжкавагавых паязздоў. Працоўнае сялянства многіх раёнаў паспяхова завяршае сельскагаспадарчы год. Своечасова выканаўшы хлебапастаўкі, Шэрашэўскі, Гайнаўскі раёны закончылі пастаўку бульбы дзяржаве.

Зараз выбарчая кампанія ўступіла ў самы адказны перыяд. Поўнасцю па абласці закончана ўтварэнне і апублікаванне выбарчых округ, выбарчых участкаў па выбарах у абласны, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Советы дэпутатаў працоўных. У округовыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі працоўныя вылучылі энергічных, здольных, чесных таварышоў зарэкамендаваўшых сябе на практычнай рабоце.

Вялікія і складаныя задачы ў выбарчай кампаніі. Дастаткова сказаць, што ў гор. Брэсце ўтворана 6 округоў па выбарах у абласны Совет, 154 округі па выбарах у гарадскі совет, 36 выбарчых участкаў. У саставе выбарчых камісій народ вылучыў 1182 чалавекі—лепшых прадстаўнікоў рабочых, служачых, інтэлігенцыі. Сярод іх депутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Варшчэўская, лепшая стахановка—токар вагонных майстэрняў Брэста Ольга Аўчарык і другія.

Людзі розных нацыянальнасцей увайшлі ў саставы выбарчых камісій. У выбарчыя камісіі Косаўскага раёна выбрана 1131 беларусаў, 124 палякі, 62 украінцы, 94 яўрэі, 50 рускіх. Гэта ашчэ раз падцвярджае аб дружбе народаў краіны Совецкіх, аб таварыстве ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Арганізацыйны перыяд у стварэнні выбарчых округ і ўчасткаў, выбарчых камісій закончыўся. Цэнтрам усёй арганізацыйна-тэхнічнай і агітацыйна-масавай работы з'яўляецца выбарчы ўчастак. Задача партыйных і совецкіх арганізацый узяць пад неаслабную ўвагу ўсю работу на ўчастках.

Значную арганізацыйна - тэхнічную работу праробіла партыйная арганізацыя горада Брэста на выбарчых участках. Для работы кожнай выбарчай камісіі падабраны добрыя памяшканні, якія ўпрыгожваюцца плакатамі, лозунгамі, партрэтамі. Члены выбарчых камісій сумесна з настаўнікамі дапамаглі горсовету папярэдне саставіць спісы выбаршчыкаў. Зараз гарадскі совет прыступае да дакладнага саставлення спісаў выбаршчыкаў, якія будуць у вызначаны тэрмін вывешаны для ўсеагульнага агляду.

Аднак паступаюць сігналы аб тым, што ў некаторых раёнах недаацэньваюць арганізацыйна-тэхнічную работу на выбарчых участках. Так у Кобрынскім раёне многія памяшканні выбарчых камісій не абсталаваны, не ўстаноўлена дзяжурства членаў камісій.

Вакол выбарчых участкаў трэба згуртаваць ранейшы актыў агітатараў, прыцягнуць да работы новых вырасшых палітычна - падрыхтаваных таварышоў з мясцовага актыва. Багаты вопыт правядзення мінулых выбараў трэба скарыстаць зараз. Задача партыйных арганізацый арганізаваць узорную работу агіткалектываў на выбарчых участках, каб поўнасцю задаволіць ідэйна-палітычныя запатрабаванні насельніцтва.

Надрэнна арганізавалі прадвыбарчую агітацыю сярод насельніцтва многія райкомы партыі (Жабінка, Высокае). Тут райкомы партыі перагледзелі стары састаў агітацыйных калектываў і дапоўнілі яго новым вырасшым актывам.

Цікава і змястоўна праводзяць заняткі ў гуртках 60 агітатараў гор. Высокае. Тут агітацыя праходзіць на роднай мове. Агітатары Дамоўскі, Каган на яўрэйскай мове растлумачваюць працоўным яўрэям выбарчы закон. Настаўнік Глет Меер зрабіў даклад выбаршчыкам на яўрэйскай мове аб літаратурнай дзейнасці пісьменніка Бергельсона.

Есць ашчэ і такія раёны, дзе агітацыйная работа сярод выбаршчыкаў разгортваецца слаба. Да такіх раёнаў адносяцца Косава, Сямяцічы і другія. 25 агітатараў з мясцовага актыва налічвае агіткалектыў, Макаркаўскага сельсовета, Сямяніцкага раёна. Агітатары адчуваюць вялікую неабходнасць у дапамозе і кіраўніцтве, але такой дапамогі не аказвае раённы камітэт партыі, ён нават не вылучыў кіраўніка агіткалектыва.

Усе гэтыя недахопы ў пастаноўцы агітацыйнай работы трэба неадкладна ліквідаваць. Трэба кожнага выбаршчыка ахапіць прадвыбарчай агітацыяй, проста і зразумела растлумачваючы Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах, паказваючы радаснае і шчаслівае жыццё працоўных СССР, трэба расказаць выбаршчыкам аб катаржным жыцці працоўных былой панскай Польшчы.

Прадвыбарчая агітацыя павінна садзейнічаць ажыўленню антырэлігійнай работы сярод насельніцтва. Гутаркі на антырэлігійныя тэмы павінны займаць адно з цэнтральных месц у палітычнай рабоце. Да правядзення гэтых гутарак трэба прыцягваць урачоў, аграномаў, інжынераў, настаўнікаў.

Хутка пачнецца вылучэнне кандыдатаў у депутаты абласнога, раённых, гарадскіх, пасялковых і сельскіх советаў. Грамадскія арганізацыі і таварыствы працоўных вылучаць кандыдатамі ў депутаты мясцовых Советаў гарачых патрыётаў социялістычнай радзімы. Задача большэвіцкага агітатара пазнаёміць з дзейнасцю кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, з яго заслугамі перад радзімай і партыяй.

Узорнай пастаноўкай агітацыйна-масавай работы на выбарчых участках забяспечым новую бліскучую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, выбарам у мясцовыя Советы лепшых сыноў і дочак нашай краіны.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Высокаўскі раён напярэдадні выбараў

Як толькі быў апублікаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы, райком партыі сумесна з райвыканкомам 13 кастрычніка склікаў сход партыйнага актыва. На гэтым сходзе былі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па разгортванню арганізацыйнай і агітацыйна-масавай работы ў сельскіх советах, прамысловых арцелях і ўстановах.

14 і 15 кастрычніка па раёну былі праведзены 310 мітынгаў, на якіх прысутнічала 22.650 чалавек. Сходы і мітынгі рабочых, служачых і сялян ператвараліся ў дэманстрацыі совецкага патрыятызма.

Несцер Карпук, селянін вёскі Міневічы, сказаў: „Я пражыў у белапанскай Польшчы 20 год і ні разу не ўдзельнічаў у выбарах. Толькі пры совецкай уладзе я стаў роўнапраўным грамадзянінам. Маю права выбіраць депутатаў у органы совецкай улады і быць сам выбраным".

Сяляне вёскі Плянта ў гонар дня выбараў абавязаліся датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па ўсіх відах паставак і грашовых плацяжах.

Пачатак выбарчай кампаніі азнаменаваўся новымі вытворчымі перамогамі ў сельсоветах, калгасах і арцелях. Такарокі сельсовет (старшыня Лапевіч) поўнасцю выканаў пастаўкі бульбы дзяржаве. Актыў сельсовета абавязаўся таксама выканаць фінансавы план 4-га квартала на 80 процантаў да дня 23 гадавіны Кастрычніка. Агародніцкі сельсовет таксама разлічыўся з дзяржавай па збожжу і бульбапастаўках.

У раёне створаны і зацверджаны округовыя і сельскія выбарчыя камісіі. Створана 25 выбарчых участкаў, зацверджаны ўчастковыя выбарчыя камісіі. У склад камісій увайшло 1461 чалавек, з якіх 1131 беларусаў, 124 палякі, 94 яўрэі, 62 украінцы і 50 рускіх. З агульнай колькасці складу камісій 356 жанчын. Цікавы і социяльны склад: сялян-беднякоў—515, сераднякоў—548, рабочых — 66, калгаснікаў—32, членаў прамысловых арцелей — 1 і больш ста чалавек інтэлігентаў — настаўнікаў, медыцынскіх работнікаў і служачых совецкіх устаноў.

У склад камісій увайшлі лепшыя прадстаўнікі працоўных. Сярод іх Ігнацюк Марыя — комсамолка, дачка былога батрака, стахановка сельскагаспадарчай арцелі „Парыжская Комуна". Тав. Ігнацюк, працуючы ў калгасе з чэрвеня ўжо выпрацавала 200 працадзён, карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод калгаснікаў.

Старшынёй участковай выбарчай камісіі ў Новасёлках выбрана сялянка Васілюк Екацерына Данілаўна. Старшынёй акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярховіцкі сельсовет выбрана сялянка Тарасюк Аляксандра Васільеўна.

Зараз у раёне праходзіць вялікая адказная работа—складаюцца папярэднія спісы выбаршчыкаў. Праз два — тры дні яны будуць гатовы для агляду. Абсталёўваюцца выбарчыя ўчасткі. У Воўчынсвім сельсавеце (старшыня тав. Пранюк) рыхтуюцца кабіны, упрыгожваецца памяшканне выбарчага ўчастка.

У работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных уключыліся тысячы актывістаў. Высокая палітычная актыўнасць мас, энтузіязм працоўных — з'яўляюцца парукай таму, што прадстаячыя выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных прынясуць новую выд[illegible]ую перамогу слаўнам[illegible] сталінск[illegible] блоку комуністаў [illegible] беспарты[illegible]

Кравяннаў,
ч. [illegible] старшыні Вы[illegible]каўскага райвыканкома.

Пры высокай актыўнасці

З кожным днём усё шырэй разгортваецца выбарчая кампанія, вырастае актыўнасць шырокіх працоўных мас.

У Вярозаўскім раёне падабраны і працуюць 250 агітатараў. Сярод іх члены партыі, комсамольцы, настаўнікі, медработнікі і сяляне-актывісты. У Рэвяніцкім сельсавеце працуюць дасяць гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У вёсках Снегавіцкага сельсовета працуе 7 гурткоў.

Выбарчая кампанія садзейнічае ўздыму вытворчасці працы. На заводзе „Бронная гара" вырасілі новыя стахановцы, як, напрыклад, рабочыя тарнага цэха т.т. Міхнюк і Казачэўскі; штодзённа на выконваючыя нормы выпрацоўкі на 150-170 процантаў. Рабочыя гантарэзнага станка таварышы Цімашэнка і Максімюк штодзённа вырабляюць па 40 хоп гонты пры норме 26.

Сяляне раёна паскорылі выкананне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. У выніку раён закончыў бульбапастаўкі і выканаў квартальны фінплан на 41 процант. За 10 дзён з 10 па 20 кастрычніка паступіла значна больш плацяжоў, чым за ўвесь час пасля ўручэння абавязацельстваў.

У звязку з падрыхтоўкай да выбараў ажывілі сваю дзейнасць варожыя элементы, якія стараліся прабрацца ў выбарчыя камісіі. Усюды гэтым спробам працоўнае сялянства дало рашучы адпор. Так у Савіновім сельсавеце пры абгаварэнні кандыдатур у выбарчыя камісіі, адведзены пяць былых солтысаў і советнікаў валасных праўленняў. Сяляне паслалі ў выбарчыя камісіі людзей, якія цвёрда стаяць на варце інтарэсаў працоўных.

У вёсцы Касевічы, Алешаніцкага сельсовета, Косаўскага раёна, былы ўласнік цагельнага завода А. Калінка імкнуўся пралезці ў выбарчую камісію. Раней яму ўдалося пралезці за ўпраўленне сельпо. На гэты раз карта ваўка ў авечай скуры была біта, яго вывелі на чыстую ваду.

А. Кударык.

У гарадской выбарчай камісіі

31 кастрычніка гарадская выбарчая камісія па выбарах у гарадскі Совет депутатаў працоўных на другім пасяджэнні заслухала пытанне аб ходзе папярэдняга складання спісаў выбаршчыкаў па гор. Брэсту.

Папярэднія спісы выбаршчыкаў у горадзе складзены з дамавых кніг у алфавітным парадку. Правільнасць запісаў правералі прыцягнутыя да гэтай работы настаўнікі і актывісты. Зараз папярэд[illegible]я спісы ўручаны старшыням [illegible]х выбарчых камісій для [illegible]вага ўдасканалення.

[illegible]ршага лістапада горвыканк[illegible]ступіў да складання спі[illegible] на Палажэння аб выбарах па існуючай форме. Гэта работа будзе арганізавана так: па [illegible]барчых участках спісы выб[illegible]каў будуць надрукаваны [illegible]шынках, па 16 участках [illegible]данні спісаў будуць [illegible] удзел настаўнікі, а ў астатніх спісы будуць складаць работнікі горвыканкома.

Уся работа па складанню спісаў будзе закончана 7 лістапада.

Гарадская камісія на гэтым пасяджэ[illegible] зацвердзіла план работы [illegible]вых выбарчых ка[illegible] [illegible]ад месяц.

Г. Савік,
сакратар гарадской выбарчай камісіі.

Па Совецкай краіне

Пераможца ў 50 кілометровым прабегу заняўшы першае месца і ўстанавіўшы Усесаюзны рэкорд (1 гадзіна 43 мінуты 30 секунд) Міхаіл Нікалаевіч Белавусаў з канём „Базамбо" (каўшкола Асоавіяхіма, Краснадарскі край).

Фота А. Братамобава.

Фота ТАСС.

Узнагароджанне ўдзельнікаў дэкады бурат-мангольскага мастацтва

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 31 кастрычніка г. г. за выдатныя поспехі ў справе развіцця бурат-мангольскага тэатральнага і музыкальнага мастацтва ўзнагароджаны:

Ордэнам Леніна — Цыдэнжапаў Гамбо Цыдэнжапавіч — народны артыст Бурат-Мангольскай АССР, мастацкі кіраўнік бурат-мангольскага Дзяржаўнага Музыкальна-Драматычнага тэатра.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу ўзнагароджана 10 чалавек. Сярод іх: **Балданс Намжыл Гармаевіч**—народны артыст Бурат-Мангольскай АССР, драматург-рэжысёр; **Гендунава Найдан Дашынамжылаўна** — заслужаная артыстка Бурат-Мангольскай АССР, артыстка бурат-мангольскага Дзяржаўнага Музыкальна-Драматычнага тэатра; **Пятрова Надзежда Казакаўна** — артыстка бурат-мангольскага Музыкальна-Драматычнага тэатра і другія.

Ордэнам „Знак почета" узнагароджана 18 чалавек.

Медалём „За трудовое отличие" узнагароджана 37 чалавек.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР за выдатныя заслугі ў развіцці тэатральнай і музыкальнай культуры прысвоены пачотныя званні раду ўдзельнікаў дэкады бурат-мангольскага мастацтва. Званне заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР прысвоена двум чалавекам, званне заслужанага артыста РСФСР—пяці чалавекам.

(ТАСС).

Увядзенне высокіх ураджаяў

Калгаснікі Лакцёўскага раёна (Алтайскі край) уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, абавязаліся да 7 лістапада ўзняць звыш плана 18 тысяч гектараў зяблева. Зараз ужо паднята на 6.500 гектараў больш плана. Ворыва працягваецца. Калгаснікі рашылі, прымяняючы вопыт перадавікоў, сабраць па 180 пудоў зярна з гектара на ўсёй плошчы.

Комсамолец Ваня Лугаўскі (Плясецкі раён, Архангельскай вобласці), які дабіўся выдатнага індывідуальнага рэкорда: у стральбе да першага промаху на дистанцыю 100 метраў па пералятаючыхся мішэнях ён 158 разоў паразіў цэль.

Фота С. Шагаль.

Фота ТАСС.

Два мільёна тамоў кніг

Одеская дзяржаўная навуковая бібліятэка адзначае 110-годдзе з дня свайго існавання. Яна доўга пачала жалкае існаванне. Сапраўдным правадніком культуры бібліятэка стала пасля Вялікай Кастрычніцкай Социялістычнай революцыі. Штодзённа яе наведваюць сотні вучоных, рабочых, студентаў. Бібліятэка распалагае кніжным фондам у 2 мільёны тамоў. Тут захоўваюцца вельмі рэдкія першадрукаваныя кнігі, у тым ліку Натуральная гісторыя" Плінія Старшага, выданая ў 1476 [illegible] ў Венецыі.

Гандлёвы порт у Рыгі.

Фота ТАСС.

Арганізацыя марскіх параходстваў у Эстоніі і Латвіі

Па рашэнню Саўнаркома Саюза ССР Народны Камісарыят Марскога Флота СССР стварыў у Прыбалтыцы два новых дзяржаўных марскіх параходствы — Эстон[illegible] [illegible] у Рыгі. У Таліне [illegible] Таліннскае [illegible] [illegible] у Пярну, у Рыгі — Рыжскае [illegible] [illegible] ў партах Ленінграда і Вентспілса.

(ТАСС)

Дастойна сустракаюць [illegible]

[illegible]ормы [illegible] Ры[illegible]цан[illegible]ток

202

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Выхоўваць кандыдатаў партыі

Неблагапалучна абстаіць справа з выхаваннем кандыдатаў партыі ў первічных арганізацыях Шаршэўскай райпартарганізацыі. Асобныя сакратары партарганізацый недастаткова засвоілі значэнне кандыдацкага стажу.

У партарганізацыі райвыканкома (сакратар тав. Кудакоўскі) ёсць 10 кандыдатаў партыі, а партарганізацыя не звяртае ўвагі на іх ідэйна-палітычную падрыхтоўку, не правярае выканання партыйных даручэнняў кандыдатамі.

Кандыдату партыі т. Агуновічу даручана забяспечыць выпуск насценнай газеты пры РВК. Мінула чатыры месяцы, а насценгазета не выпускаецца. Ён вельмі слаба вывучае гісторыю ВКП(б). Кандыдат партыі тав. Баеў зусім не мае партдаручэння, гісторыю партыі не вывучае, слаба чытае мастацкую літаратуру.

Не мае партыйнага даручэння і кандыдат партыі т. Зімін. Ён працуе дыспетарам райпромкамбіната, партарганізацыі звяртаў аб цяжкасцях у рабоце, асабліва з падборам кадраў, але партарганізацыя дапамогі ў яго рабоце не аказвае.

Не так паўно быў прыняты ў кандыдаты партыі т. Маёраў. Павышэнне сваёго палітычнага ўзроўню ён не займаецца. Первічная партарганізацыя не правярае яго і не дапамагае ў рабоце.

Слаба работае з кандыдатамі партыі і первічная партарганізацыя судоваследчых устаноў (сакратар тав. Савіцкі). У арганізацыі 4 кандыдаты. Іх неабходна прыцягнуць да актыўнага партыйнага жыцця — даць кожнаму партдаручэнне і правяраць выкананне. На справе атрымоўваецца інакш. Кандыдат партыі тав. Панамарчук два месяцы састаіць у партарганізацыі, а партыйнага даручэння не атрымаў. Нядаўна прынятыя кандыдаты партыі тт. Саўчанка і Тедзежвілі слаба работаюць над сабой, не павышаюць сваёго палітычнага ўзроўню, на партсходах рэдка выступаюць.

Райком КП(б)Б за ўвесь час ні аднаго разу не сабіраў паралу кандыдатаў партыі, каб абмяняцца вопытам работы, даведацца, як яны выконваюць статутныя патрабаванні нашай партыі, падказаць ім у рабоце, павучыць.

Як не дзіўна, але так атрымоўваецца, што райком партыі ні разу не заслухоўваў справаздачу сакратароў первічных партарганізацый спецыяльна аб рабоце з кандыдатамі партыі.

Інструктары райкома КП(б)Б рэдкія госці ў первічных партарганізацыях, яны ў большасці знаходзяцца ў сельсоветах па выкананню гаспадарча - палітычных кампаній.

Партыйныя сходы — школа большавіцкага выхавання кандыдатаў партыі. Неабходна ўдзяліць больш увагі падрыхтоўцы і правядзенню сходаў, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу кандыдатаў у абмеркаванні пытанняў, якія ставяцца на партыйных сходах.

Нарэшце трэба, каб райком партыі ўзмацніў кіраўніцтва выхаваўчай работай сярод кандыдатаў партыі. Кіраўнікі партарганізацый павінны зразумець, што работа з кандыдатамі партыі — ёсць важнейшая партыйная справа.

Выхоўваць свядомых, актыўных, беззаветна адданых справе комунізма большавікоў — галоўная задача партарганізацый у рабоце з кандыдатамі партыі.

М. Гурэвіч.

Гарадскі сход комсамольскага актыва

30 кастрычніка адбыўся сход комсамольскага актыва горада Бреста. Сход заслухаў і абгаварыў даклад сакратара ГК ЛКСМБ тав. Арцем'ева аб выніках работы XIV з'езда комсамола Беларусі. Дакладчык вельмі многа гаварыў аб прынятых з'ездам рашэннях і не расказаў, як ком амольская арганізацыя горада перабудоўвае сваю работу адпаведна з гэтымі рашэннямі. Вельмі мала застанавіўся дакладчык на такіх важных пытаннях, як падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. У гэтай галіне ён абмежаваўся тым, што назваў лічбу вылучаных агітатараў і прывёў прыклады двух-трох агітатараў, якія прыступілі да работы. Як работаюць астатнія агітатары, з даклада нельга было заключыць.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы ў большасці гаварылі аб тым, як перабудоўваюць сваю работу первічныя арганізацыі і гарком комсамола на аснове рашэнняў з'езда ЛКСМБ і XI пленума ЦК ВЛКСМ. Яны крытыкавалі работу пастаянна дзейнічаючых камісій ГК ЛКСМБ за слабую сувязь з комсамольцамі і несаюзнай моладдзю прадпрыемстваў, школ і ўстаноў. Значнае месца ў выступленнях было ўдзелена становішчу разгортвання агітацыйна-масавай работы на выбарчых участках.

Выступіўшая маладая комсамолка тав. Ніоінгольц (кінофікацыя) падзялілася вопытам агітацыйнай работы на выбарчым участку.

— Яшчэ ў час выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР, — гаворыць яна, — я была вылучана работаць на ўчастках у дапамогу агітатару. Акуратна наведвала заняткі, палітычна ўзрасла. Хутка адчула сілу і здольнасць і стала самастойна работаць у якасці агітатара. Для таго, каб заняткі па таму ці іншаму пытанню праходзілі поўнацэнна пры зацікаўленнасці слухачоў, я імкнулася сваю гутарку ўвязываць з мясцовымі фактамі, параўноўваючы цяжкае жыццё працоўных раней з шчаслівым і радасным зараз у краіне.

— У маім гуртку, — гаворыць яна, — была адна грамадзянка, якая не наведвала заняткаў, гутарак. Я пабывала ў яе дома і даведалася, у чым справа. Аказалася, што агітатары, якія раней працавалі, мала звярталі ўвагі на яе запатрабаванні. У яе дзіця не было прынята ў школу. Маці агарчалася, прасіла дапамагчы. Агітатары ёй абяцалі і вышаўшы з яе дома аб гэтым забывалі. На мае словы, што будзе абавязкова аказана дапамога, гэта грамадзянка адказала:—Ведаю, такія абяцанні для мяне неўпершыню. Пры маёй дапамозе яе дзіця было прынята ў школу. Маці засталася задаволенай і яна акуратна наведвае заняткі, сходы. Я прывяла гэты прыклад для таго, каб нашы агітатары ў сваёй рабоце з выбарчыкамі не абмяжоўваліся перасказваннем выбарчага закона і Канстытуцыі, а глыбока цікавіліся жыццём і патрабаваннямі выбаршчыкаў. Толькі пры такіх абставінах наша агітацыйная работа ў масах будзе куды дасканалей і каштоўней.

Комсорг ЦК ВЛКСМ школы № 7 тав Сокалава крытыкавала ГК ЛКСМБ за слабую работу з маладымі агітатарамі.

Комсамольскай арганізацыяй нашай школы,—гаворыць яна,—былі вылучаны агітатары. Гарком комсамола правёў з імі семінар і да рэчы сказаць прайшоў ён вельмі дрэнна. На гэтым гарком і абмежаваў сваю роль. Ні адзін з агітатараў не прымацаваў да пэўнага ўчастка. Яны да гэтага часу не прыступілі да агітацыйнай работы сярод насельніцтва.

Не прыступіла да агітацыйна-масавай работы на выбарчым участку і комсамольская арганізацыя вагоннага ўчастка. Аб гэтым гаварыў у сваім выступленні тав. Малаткоў.

Сакратар комсамольскай арганізацыі паравознага дэпо тав. Парфенаў расказаў аб росце вытворчай актыўнасці сярод комсамольцаў і несаюзнай моладзі ў сувязі з правядзеннем выбарчай кампаніі. 15 кастрычніка, у дзень абвяшчэння пачатку выбарчай кампаніі, комсамолец — электразваршчык тав Кажэмякін стаў на сталінскую вахту і за 8 гадзін работы выканаў план на 813 процантаў. Ён абавязаўся штодзённа даваць прадукцыі не менш чым 400 процантаў плана. Штодзённа выконвае план на 150 і больш процантаў і комсамолец — каваль тав. Кумачка. Машыніст-комсамолец тав. Стайчанка за 8 месяцаў работы не меў ні аднаго выпадку рамонту паравоза. За час работы на паравозе ён даў многа эканоміі паліва. Добра работае комсамольскі паравоз, ён па сваім паказчыкам лічыцца перадавым на Брэсцкім чыгуначным вузле. За апошніх два месяцы на паравозе зэканомлена паліва на 1892 рублі.

На сходзе актыва выступілі таварышы: Караткоў — сакратар ГК КП(б)Б і Мазураў — сакратар абкома комсамола. Яны падрабязна спынуліся на задачах комсамольскай арганізацыі ў галіне палепшання пастаноўкі ўнутрысаюзнай работы, на ўдзеле яе ў важнейшым дзяржаўным мерапрыемстве — выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Г. Паўлаў.

...СМБ не кіруе вучобай

...заўскі райком комсамола ...кова займаецца ідэйна-...ым ростам комсамольцаў ...ай моладзі. Вельмі рэдка ...ніца даклады і гутаркі ...ні іншую цікавячую моладзь тэму. Нічога райком комсамола не робіць па дапамозе вывучаючым „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)".

Самаўхіленне РК ЛКСМБ ад прапаганды рэвалюцыйнай тэорыі дае сабе адчуваць у первічных комсамольскіх арганізацыях. Значная колькасць комсамольцаў не работаюць над павышэннем сваіх палітычных ведаў. Гэта пачынае адбівацца на дзеяльнасці ...ых асобных комсамольцаў, ...ляе пільнасць. У арганізацыі ёсць факты страты комсамольскіх білетаў. Міма іх праходзіць РК ЛКСМБ. Так, комсамолец тав. Яроцкі Олег два месяцы таму назад згубіў комсамольскі білет. Райком комсамола (сакратар тав. Вашкевіч) не разгледзеў на сваім пасяджэнні гэтага пытання, не пацікавіўся прычынай згубы комсамольскага білета.

К. П. Казінскі.

Бібліятэкар абласнога Дома партасветы А. А. Чупахіна падрыхтоўвае выстаўку літаратуры у дапамогу агітатару.

Фота В. Лупейка.

Да XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

НАЙВЯЛІКШАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ Ў СВЕЦЕ

Дваццаць тры гады назад, 7 лістапада (25 кастрычніка) 1917 года, рускі рабочы клас і сялянская беднота, кіруемыя партыяй большавікоў, зрабілі пролетарскую сацыялістычную рэвалюцыю. У чым адрозненне гэтай рэвалюцыі ад усіх іншых рэвалюцый?

„Гісторыя народаў, —гаворыць таварыш Сталін, ведае нямала рэвалюцый. Яны адрозніваюцца ад Кастрычніцкай рэвалюцыі тым, што ўсе яны былі аднабокімі рэвалюцыямі. Змянялася адна форма эксплаатацыі працоўных другой формай эксплаатацыі, але сама эксплаатацыя заставалася. Змяняліся адны эксплаататары і прыгнятальнікі іншымі эксплаататарамі і прыгнятальнікамі, але самі эксплаататары і прыгнятальнікі заставаліся. Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя паставіла сабе мэтай — знішчыць усякую эксплаатацыю і ліквідаваць усіх і ўсякіх эксплаататараў і прыгнятальнікаў".

Кастрычніцкая рэвалюцыя справядліва названа народамі ўсяго свету Вялікай Сацыялістычнай рэвалюцыяй.

Па сваіх выніках і значэнню, па свайму размаху Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў СССР ёсць самая велічная з усіх рэвалюцый. Яна ўпершыню у гісторыі чалавецтва знішчыла ўсякую эксплаатацыю чалавека чалавекам, усякі прыгнёт: эканамічны, палітычны і нацыянальны. Яна паставіла ва ўладзе рабочы клас, зламала буржуазную дзяржаўную машыну і стварыла новую дзяржаву дыктатуры рабочага класа.

Вялікая пролетарская рэвалюцыя знішчыла прыватную ўласнасць на фабрыкі і заводы, банкі і сродкі зносін, на воды і лясы, на зямлю і яе нетры. Усё гэта стала ўсенародным здабыткам — грамадзкай, сацыялістычнай уласнасцю. З прыгнечанага і эксплаатуемага рабочы клас стаў свабодным і пануючым класам у СССР, які працуе без гаспадароў, без капіталістаў і накіроўвае ўсё грамадства да комунізма. Комуністычная рэвалюцыя дапамагла працоўнаму сялянству скінуць з сваіх плеч ярмо памешчыкаў, капіталістаў, кулакоў, купцоў і спекулянтаў; яна зрабіла магчымым пераход сялян на новы, калгасны шлях — шлях шчаслівага, заможнага жыцця ў калектыўных гаспадарках.

Такім чынам, Кастрычніцкая рэвалюцыя ў корані змяніла ўвесь лад і парадак жыцця на совецкай зямлі, ачысціўшы яе ад усялякіх эксплаататараў і прыгнятальнікаў.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя мае велізарнае міжнароднае значэнне, бо яна нанесла сакрушальны ўдар па суветнаму панаванню капітала, расколоўшы свет на дзве часці: свет сацыялізма і свет капіталізма. Цяпер чалавецтва ведае дзве сістэмы: капіталістычную, паміраючую, загніваючую, здыхаючую ў муках крызісаў і крывавых войн, і сацыялістычную, дзе шчасліва і дружна жывуць народы, выклікаючы да сябе любоў працоўных усіх краін.

Многа паўстанняў і рэвалюцый бачыў стары свет, але падобных Кастрычніцкай рэвалюцыі гісторыя пакуль яшчэ не ведала.

Звыш двух тысяч год назад адбылося грандыёзнае паўстанне рымскіх гладыятараў пад старшынствам Спартака. Хоць паўстаўшыя захапілі ўсю Паўднёвую Італію, але ў канцы канцоў былі разбіты рабаўласнікамі.

Калі рухнуў рабаўласніцкі лад, памяліся новыя эксплаататары і эксплаатуемыя: памешчыкі-феадалы, з адной стараны, і прыгнечаныя сяляне, з другой.

Сялянства не раз падымалася на вайну супроць феадалаў. Вуйныя сялянскія паўстанні патрасалі Еўропу, у тым ліку і Расію. Усе яны заканчваліся пагромам прыгнечаных мас. Так, у Італіі пад кіраўніцтвам Дольчыно сялянскае паўстанне прадаўжалася чатыры гады (1303—1307). Паўстаўшыя былі пераможаны, а кіраўнік спалены на кастры. Карл Гільом—правадыр „Жакеры", сялянскага паўстання ва Францыі, быў „каранаваны" распаленым трыножнікам, а затым яму адрэзалі галаву (у 1358 годзе). Паўстанне рускіх сялян пад вадзіцельствам Івана Балотнікава (1606—1607 гады) закончылася няўдачай. Сялян Разіна правёў казакаў і сялян з Дона да Сімбірска (1669—1671 годы), але паўстанне было падаўлена, Разіна чацвертавалі ў Маскве. Пакаран быў смерцю і Емельян Пугачоў, падняўшы паўстанне сялян у Паволжы і на Урале (1773—1775 годы).

Сто пяцьдзесят з лішкам год назад французская буржуазная рэвалюцыя знішчыла феадальныя парадкі і ўстанавіла капіталістычныя. Змянілася форма эксплаатацыі, але эксплаататары засталіся.

Першай гераічнай, але ўсё-ж беспаспяховай спробай рабочага класа знішчыць капіталістычную эксплаатацыю была Парыжская Комуна (1871 год). За 72 дні свайго існавання яна здолела правесці рад мерапрыемстваў, накіраваных на палепшанне жыцця рабочых. Але Комуна не паспела паказаць народным масам матэрыяльных результатаў рэвалюцыі. Гэта было зроблена толькі Вялікай Сацыялістычнай рэвалюцыяй у СССР, кіраўніцтва якой належыла выключна партыі Леніна-Сталіна.

Іменна тая акалічнасць, што на чале Кастрычніцкай рэвалюцыі стаяла выпрабаваная і загартаваная ў баях большавіцкая партыя, і забяспечыла перамогу рабочага класа. Пролетарыят знішчыў капіталістычны гаёт і ўстанавіў совецкую ўладу як дзяржаўную форму дыктатуры рабочага класа.

Пад кіраўніцтвам большавіцкай партыі Совецкі Саюз стаў магутнай і непрыступнай крэпасцю сацыялізма.

Ф. Вілін.

Новыя задачы вытворча-тэхнічнай адукацыі

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах заклікан адыграць велізарную ролю ў далейшым падъёме эканамічнай і абаронай магутнасці Совецкага Саюза.

У ходзе развіцця нашай сацыялістычнай гаспадаркі на кожным новым этапе ўсё большае значэнне набывала задача планамернай, арганізаванай падрыхтоўкі прамысловых кадраў. Існуючая да апошняга часу сістэма падрыхтоўкі гэтых кадраў перастала задавальняць патрэбы індустрыі і транспарта. Дастаткова сказаць, што за гады другой пяцігодкі па ўсіх галінах прамысловасці школамі вытворча-тэхнічнай адукацыі (у тым ліку і школамі ФЗУ) было выгушчана толькі адзін мільён чатырыста тысяч кваліфікаваных рабочых. Між тым, Указ ад 2 кастрычніка канстатуе, што неабходна штогод рыхтаваць для перадачы ў прамысловасць дзяржаўных працоўных рэзервы ў колькасці ад васьмісот тысяч да аднаго мільёна чалавек.

Адным з асноўных відаў падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых з моладзі былі школы фабрычна-заводскага навучэйства, вырасціўшыя многа выдатных стаханаўцаў ва ўсіх галінах прамысловасці. Нямала былых выхаванцаў школ ФЗУ стала камандзірамі вытворчасці, знатнымі людзьмі Совецкага Саюза.

Аднак сістэма вытворча-тэхнічнага навучання у школах ФЗУ ...ствала многімі арганізацыйнымі і ...метадычнымі парокамі. У школах ФЗУ ...дастатычна не было ні ...ага кіруючага центра: кіравалі імі і дырэктары прадпрыемстваў і галоўныя ўпраўленні вучэбных устаноў (ГУВУ) наркаматаў.

Кожнае ведамства ўстанаўлівала свае тэрміны навучання: у адным месцы слесароў рыхтавалі поўтара года, у другім—два. Не было адзіных праграм, падручнікаў. Усё больш і больш нарастаў разрыў паміж метадамі падрыхтоўкі кадраў у школах ФЗУ і растучай тэхнікай вытворчасці. У той час, як цэхі прадпрыемстваў абсталёўваліся станкамі і агрэгатамі навейшых сістэм, многія школы ФЗУ прадаўжалі навучаць моладзь на ўстарэлым абсталяванні.

Падрыхтоўка новых кадраў не была цэнтралізавана. Кожнае прадпрыемства рыхтавала кадры толькі для сабе, рыхтавала рамеснікі, узгадняючыся толькі з патрэбамі „бягучага моманту". Такім чынам, адбывалася, што, калі прадпрыемства „насычалася рабочымі той або іншай прафесіі, заводская школа ФЗУ пераставала іх рыхтаваць. Цэлых два гады па гэтай прычыне не рыхтавала трыістаў школа ФЗУ аўтазавода ім. Сталіна.

Школа ФЗУ завода „Красный треугольник" пастаянна скарачала выпуск рабочых асноўных спецыяльнасцей і ў апошні час рыхтавала толькі слесараў, электрамантёраў і токараў па металу. Аднак, школа ФЗУ завода „Серп і молат", маючы ўсе ўмовы для падрыхтоўкі вальцаўшчыкоў, апошнія гады не рыхтавала іх. Яе магчымасці былі яўна заніжаны, пры чым іменна таму, што дзейнасць яе абмяжоўвалася патрэбамі завода.

Зусім натуральна, што падрыхтоўка кадраў для прамысловасці не магла заставацца ў такім становішчы. Перад дзяржавай паўстала „задача арганізаванай падрыхтоўкі новых рабочых з гарадской і калгаснай моладзі і стварэння неабходных працоўных рэзерваў для прамысловасці" (з Указа ад 2 кастрычніка).

Гістарычны Указ адкрыў новы этап расшыранага сацыялістычнага ўзнаўлення рабочай сілы, паклаў аснову новай устойлівай сістэме вытворча-тэхнічнага навучання моладзі ў нашай краіне.

Адгэтуль вытворча-тэхнічнае навучанне маладых рабочых будзе вытвараецца планамерна, з улікам патрэб усёй прамысловасці ў цэлым Саматужніцтву, маўшаму месца ў гэтай важнай справе, прыйшоў канец. Цяпер будуць адзіныя тэрміны навучання, адзіныя падручнікі, адзіныя праграмы.

Значна расшыраецца кантынгент навучаючыхся. Ужо ў гэтым годзе ў Рамесленых і Чыгуначных вучылішчы будзе прынята 350 000 чалавек і ў школы Фабрычна - Заводскага Абучэння — 250.000.

Калі ў школах ФЗУ вучыліся пераважна дзеці гаражан, то цяпер у Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння прызываюцца і дзеці гаражан і дзеці калгаснікаў.

Указ аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах з'яўляецца выдатным прыкладам сталінскіх клопатаў аб моладзі.

Дзяржава забяспечвае навучаючыхся Рамесленых і Чыгуначных Вучылішч і школ ФЗА падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, харчаваннем, адзеннем, бялізнай, абуткам. Абучэнне вытвараецца бясплатна. Для іншагародніх і жыхароў сельскіх мясцовасцей арганізуюцца інтэрнаты. Клапатліва навучаныя і выхаваныя дзяржавай падлеткі абавязаны па сканчэнні вучылішча або школы чесна выканаць свой доўг перад радзімай. „Устанавіць, — гаворыцца ва Указе ад 2 кастрычніка, — што ўсе, скончыўшыя Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы, і школы Фабрычна-Заводскага Абучэння лічацца мабілізаванымі і абавязаны прапрацаваць 4 гады падрад на дзяржаўных прадпрыемствах, па ўказанню Галоўнага Упраўлення Працоўных Рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР, з забеспячэннем ім зарплаты па месцу работы на агульных асновах".

Моладзь нашай краіны, сотні і тысячы юнакоў, ужо зараз, не чакаючы прызыва, падаюць заявы з просьбай аб залічэнні іх у вучылішчы і школы ФЗА.

Дзеці шахцёраў гор. Сталіно—комсамольцы А. Бандарэнка — сын забойшчыка шахты № 30, І. Лапата — сын качагара шахты № 17—17 біс., А. Омараў—сын дзесятніка шахты № 31, Д. Кудзінаў — сын забойшчыка № 30, В. Толоцікаў — сын забойшчыка шахты № 31 і П. Мышленка—сын крэпільшчыка той-жа шахты — звярнуліся да дзяцей гарняко? Данбаса, Кузбаса і Падмаскоўнага басейна з заклікам „добраахвотна ісці ў адкрываемыя школы Фабрычна-заводскага Абучэння, вучыцца шахцёрскаму рамяству, авалодваць гаваровай у нашай краіне прафесіяй шахцёра.

У сваім пісьме комсамольцы пішуць:

„Нашы бацькі праліваді кроў, каб забяспечыць для нас шчаслівае жыццё. Комуністычная партыя большавікоў і совецкі ўрад праяўляюць сталінскія клопаты аб падрастаючым пакаленні, аб яго адукацыі і працоўным выхаванні. Указ з'яўляецца яркім прыкладам гэтых клопатаў.

Мы ахвярда рашылі пайсці ў школу Фабрычна-Заводскага Абучэння і авалодаць прафесіяй шахцёра. Уся краіна ведае дынастыю металургаў Корабавых. Унаследуем прафесію сваіх бацькоў, створым слаўныя шахцёрскія дынастыі, у якіх любоў да шахты, да гарняцкага рамяства будзе пераходзіць ад бацькі да сына".

Наша моладзь добра ўсведамляе свой доўг перад радзімай. Будучыя шахцёры пішуць:

„Ганаровая праца гарняка. Вугаль, здабыты шахцёрамі, палае ў топках электрастанцый, паравозаў, караблёў і параходаў, абагравае вучылішчы, школы, бальніцы, клубы. Прыемна ўсведамляць, што плады тваёй працы неабходны грамадству, прыносяць родной краіне вялікую карысць".

Пачалася практычная падрыхтоўка да работы вучылішч і школ ФЗА.

У Маскве стараецца 80 Рамесленых Вучылішч, у якіх будзе вучыцца больш 45 тысяч падлеткаў.

Звыш 7 тысяч чалавек будзе вучыцца ў 16 школах ФЗА. Каля тысячы юнакоў прымаюць чатыры Чыгуначных вучылішчы. З Рамесленых вучылішч Масквы выйдуць, галоўным чынам, кваліфікаваныя слесары, токары, фрэзероўшчыкі, шліфавальшчыкі і рабочыя другіх прафесій, патрэбных ...ладаючай прамысловасці. ...ўскія школы ФЗА будуць ...ым рыхтаваць ...бочых ...васці.

У А... ...о Раме... школ ... навуча... значы... ліфіка...ныя вучылішчы павінны абучаць бурыльшчыкаў, аператараў па здабычы нафты, брыгадзіраў па падземнаму рамонту. Школы ФЗА будуць выпускаць рабочых масавых прафесій — памочнікаў бурыльшчыкаў, рабочых падземнага рамонту.

Па ўсяму Саюзу для прадпрыемстваў чорнай металургіі стараецца каля 50 Рамесленых вучылішч з 25 700 навучаючыміся і 55 школ ФЗА на 23 тысячы чалавек. Патрэба ў рабочай сіле ...асобных прадпрыемствах чорнай металургіі вельмі вялікая. Пагэтаму ў першы час галоўная ўвага ўдзяляецца школам ФЗА, якія падрыхтуюць у кароткі тэрмін рабочых масавых прафесій.

На вытворчай базе Магнітагорскага завода будуць навучацца рабочыя — металургі, ко... сахімікі, гарнякі і рабочыя падсобных вытворчасцей. Акрамя таго, найбольш буйныя Рамесленыя Вучылішчы і школы ФЗА адкрываюцца на Кузнецкім, Макеўскім, Краматорскім заводах.

Па ўсяму Саюзу з дня ў дзень шырыцца рух моладзі, імкнучайся ў вучылішчы і школы, жадаючай атрымаць кваліфікацыю, адказваючую патрэбам совецкай дзяржавы.

Совецкая моладзь любіць працаваць. Жывая, творчая кваліфікаваная праца — гонаровая шчасце нашай моладзі. Вось чаму з такім велізарным задавальненнем ...ым радасным адабрэннем ...устрэла Указ Прэзідыума ... Совета СССР ...



Беластоцкі ваціна-ватны камбінат № 32 створан з 12 дробных фабрык. Выпуск прадукцыі камбіната павялічыўся амаль у дзесяць разоў.

Н а з д ы м к у: новы ткацкі цэх.

Фотахроніка Белта.

У сельскай школе

Канец кастрычніка. Раніцой школьны двор і кветнікі пакрываюцца тонкім слоем снегу. Мароз шчыпае за пальцы, румяніць шчокі рэбят, бягучых у школу. Вось расчыніліся дзверы школы. Прыемная цеплыня, чыстыя сонечныя класы чакаюць рэбят...

Хутка прабеглі два месяцы. Гэтыя дні для настаўнікаў Іодчыцкай школы былі напоўнены вялікай крапатлівай работай. Своечасова і добра падрыхтаваліся да пачатку запяткаў, адрамонтавалі памяшканне, загатовілі дровы! Але з першых дзён заняткаў з'явіліся новыя клопаты. Частка рэбят не хадзіла ў школу. Усе настаўнікі палічылі сваім абавязкам ісці да бацькоў і растлумачыць неправільнасць іх дзеянняў.

Сходы ў школе, у сельсавеце, у вёсках па хатах. Гутаркі з асобнымі бацькамі праводзіліся бесперапынна. Настаўнікі даказвалі, да чаго прыводзяць пропускі ўрокаў, што парушае другагодніцтва. І тут-жа расказвалі аб выхаванні дзяцей у сям'і, аб рэжыму для школьнікаў. Настаўнікам дзейсна дапамагаў бацькоўскі камітэт — актывісты т.т. Войцышук А., Тойтало А., Мулярчык І і іншыя. Хутка былі бачны вынікі. Удалося вярнуць рэбят у школу, вызваліць іх ад хатніх работ.

Гэта вялікая, адабраўшая многа сіл і часу работа, не толькі не адцягнула настаўнікаў ад асноўнай справы — сур'ёзных заняткаў у класе,—але і падвоіла жаданне працаваць так, каб усіх да адзінага рэбят зацікавіць вучобай. Прывіць ім густ да школы, класа, каб школа ў іх жыцці была на першым плане.

Сур'ёзныя, удумлівыя адносіны да справы характэрны для ўсяго калектыва ў цэлым. Дырэктар тав. Купрэенка, загадчык навучальнай часткі тав. Дзенісюк, настаўнікі Голуб, Раждзественская, Круліеўскі, Зіман і іншыя заўсёды рыхтуюцца да ўрокаў, уважліва наглядаюць за выкананнем хатніх заданняў вучнямі. Тых вучняў, якія не выканалі заданне дома, пакідаюць рыхтавацца іх у класе пад кантролем настаўніка. З адстаючымі правядзіцца па 3 — 4 разы ў тыдзень дадатковыя заняткі, больш усяго па матэматыцы і беларускай мове.

Нямала зроблена школай і па выхаванню ў вучняў свядомай дысцыпліны. У пачатку года былі выпадкі позніх прагулак вучняў на вёсны, паводзінне вечарынак. З дапамогай бацькоўскага актыва ўдалося ліквідаваць гэты недахоп.

Але ўсё-такі выхаваўчых мерапрыемстваў школа праводзіць недастаткова. Часы па пазакласную работу настаўнікі скарыстоўваюць толькі на чытку газет. У школе існуе толькі адзін харавы гурток. Не праводзіцца цікавых гутарак. Гэтыя недахопы школа сумее хутка выправіць.

Нельга ўмаўчаць аб цікавым і патрэбным пачынанні—арганізацыі пышкольнага агарода. Сіламі вучняў вясной быў пасаджан агарод. Самі рэбята палівалі, палолі, акучвалі расліны. Вылучылася ініцыятыўная група дапучат: Соня Мушынская, Зіна Шымончык, Вера Мышынская, Ліда Ганчар і іншыя. Пры школе ёсць невялікі сад. Рашана вясной пасадзіць 50 новых дрэў і зрабіць агарод, сапраўдны паказальны ўчастак, дзе вучні старшых класаў будуць на практыцы атрымоўваць веды і працоўныя навыкі. У школе для гэтага ёсць усе ўмовы, ёсць і выдатныя кіраўнікі, цікавячыяся гэтай справай.

Праз некалькі дзён заканчваецца першая чвэрць вучэбнага года. У школе пачалося падвядзенне вынікаў. Ідзе дзейсная падрыхтоўка да 23 гадавіны Кастрычніка. Старшакласнікі з кіраўніком фізкультуры тав. Бароўскім рыхтуюцца да ўдзелу ў дэманстрацыі, вывучаюць песні. Рыхтуецца святочны нумар насценгазеты. Падводзяцца вынікі соцпаборніцтва. Ва ўсім гэтым відна работа энергічнага комсамольца-дырэктара школы тав. Купрыенка. Дружна работае ўвесь настаўніцкі калектыў, і ў іх справах у школе і па-за школай бачна работа перадавых грамадскіх дзеячоў у жыцці вёскі.

С. Сурэўцова,
Іодчыцкая НСШ, Альбінскага сельсавета, Косаўскага раёна.

Шасейная дарога адлегласцю ў 50 кілометраў злучыла раённы цэнтр—Несвіж з абласным цэнтрам гор. Баранавічы. Яна пабудавана скорасным метадам сялянамі Несвіжскага і Баранавіцкага раёнаў.

Фота В. Лупейка. *Фотахроніка Белта.*

УРОК — НАЙЛЕПШЫ СРОДАК ВЫХАВАННЯ

Дзесятае НСШ, першы клас. Настаўніца тав. Птакоўская вядзе ўрок чытанкі. І ў гэты час ты забываеш, што сядзіш паміж васьмігадовых рэбят, забываеш, што гэта для іх гаворыць настаўніца. Так цікава, проста і захапляюча тав. Птакоўская вядзе ўрок.

У гэтыя мінуты настаўніца жыве адзнымі пачуццямі з дзецьмі, сумесна з імі перажывае тое, аб чым яна гаворыць.

Гутарка аб Леніне. Настаўніца расказвае рэбятам у простых, цёплых выразах аб Владзіміру Ільічу. Пасля задае пытанні вучням. Яны па чарзе поўнымі фразамі адказваюць па-свойму, падзіцячаму, але ў гэтых адказах выдатны змест. Вось уздымаецца маленькі крэпыш і гаворыць: „Ленін вёў рабочых на барацьбу з буржуямі і гэта барацьба скончылася перамогай рабочых".

Дзеці далей расказваюць, як Ленін вучыў добра працаваць, што Владзімір Ільіч найлепшы настаўнік працоўных, бо ён вучыў іх бацькоў, усіх рабочых і сялян, як патрэбна жыць і змагацца.

Настаўніца не любіць непрадуманых адказаў, а пагатаму раіць дзецям: раней чым адказаць, абдумаць усебакова пытанне.

—Скажыце, рэбяты, Ленін вучыў працаваць па-ударнаму, як вы гэта разумееце!

—Працаваць хутка і добра,—адказвае дзяўчынка. І першакласнікі па чарзе расказваюць з гонарам аб стаханаўскай працы сваіх бацькоў на швейнай фабрыцы, у майстэрнях.

—Чаму яшчэ вучыў Ленін?

— Быць дысцыплінаваным, — пасведчыў адказ. Настаўніца звяртае ўвагу дзяцей на тое, што Ленін вучыў не толькі дарослых, але і дзяцей добрасумлена адносіцца да сваіх абавязкаў, гэта значыць, добра вучыцца.

Далей з простай і зразумелай гутаркі вучні даведваюцца аб інтэрнацыянальнай сутнасці вучэння Леніна.

Дзеці расказваюць аб незабыўных і шчаслівых днях верасня 1939 г., калі яны ўдзельнічаюць убачылі Чырвоную Армію—вызваліцельніцу. Рэбяты расказалі аб той радасці, з якой яны сустракалі чырвоных воінаў.

На працягу ўсяго ўрока відаць, што вучні адчуваюць велізарную любоў да Владзіміра Ільіча, а таму кожны з любоўю запісаў у свой сшытак: „Владзімір Ільіч Ленін".

Гутарка замацоўваецца. Дзеці па чарзе чытаюць артыкул аб Леніне з чытанкі для першага класа. І з гордасцю гучаць прыемныя дзіцячыя галасы: „Ленін наш кіраўнік, наш настаўнік, наш прыяцель. Мы робім так, як вучыў нас Ленін. Усе працоўныя ведаюць і любяць Леніна".

Пасля следуе пераказ. І дзеці вусна расказваюць аб любімым праведыру. „Мы любім Леніна таму, што ён хацеў, каб рабочым і нам, дзецям, жылося добра, весела, каб нашы бацькі мелі работу".

Настаўніца Птакоўская мала гаворыць на ўроках, яна актывізіруе клас, што бессумненна становіча адбіваецца на паспяховасці вучняў.

Тав. Птакоўская ўмела трымае клас. Рэбяты дысцыплінаваны, актыўны, добра вучацца. У сярэдзіне ўрока яна прапанавала вучням запісаць у сшыткі мудрыя словы Леніна: „Вучыцца, вучыцца і вучыцца". Яна расказала аб выдатных правах совецкіх грамадзян, якія запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі.

Гэты ўрок у самым малодшым класе 10 НСШ паказаў, як можна пабудаваць урок і скарыстаць яго як найлепшы сродак выхавання нашай дзетвары. Вучні добра засвоілі пройдзены матэрыял, многа новага і цікавага даведаліся ад настаўніцы.

Зразумела, што тав. Птакоўскай правесці такі ўрок удалося дзякуючы абдуманай падрыхтоўцы да яго, дзякуючы любві да ганаровай работы педагога, любві да сваіх выхаванцаў.

Н. А. Рабоўкі.
інспектар горана.

ВЫЗВАЛЕНАЯ ПРАЦА

Цвікакалодачная фабрыка ў Сямяшчах прыклад таго, як за год совецкай улады ператварылася старае запушчанае прадпрыемства ў новае, соцыялістычнае.

Пры панаванні гаспадара гэта фабрыка працавала 7-8 месяцаў у годзе, а астатні час сотні рабочых павінны былі шукаць работу. Іх сем'і галадалі, таму што такой работы не знаходзілася ў Сямяшчах.

Па-новаму зажыла фабрыка пасля прыходу Чырвонай Арміі. Рабочы калектыў тут павялічыўся ўдвая. Фабрыка працуе круглы год. І прадукцыйнасць працы такая высокая, якой не ведалі былыя гаспадары.

Дзевяцімесячны план гэтага года фабрыка выканала на 141 процант. Рабочы калектыў бесперапынна працуе над павышэннем вытворчасці, паляпшэннем якасці прадукцыі, умацаваннем працоўнай дысцыпліны. 50 рабочых выконваюць свае нормы ад 130 да 253 процантаў. Стаханаўская работа забяспечвае высокія заработкі. Рабочы цвікавага цэха стаханавец тав. Фішэр зарабатвае ў месяц 600 рублёў. Рабочы Кравец, выконваючы нормы на 172 процанты, зарабатвае ў месяц 600 рублёў. Заработак асобных рабочых дасягае больш 700 рублёў.

Цікавы і наступны лічбы [illegible] заработак аднаго рабочага ў дзень складае [illegible] руб. 73 кап., а фактычна рабочы атрымоўвае 13 руб. 40 кап.

Калектыў фабрыкі змагаецца за паніжэнне сабекошту. Сабекошт пары калодак па плану вызначан у 6 руб. 2 кап., але дзякуючы высокай прадукцыйнасці працы пара калодак каштуе толькі 3 руб. 18 кап.

Фабрыка працуе рэнтабельна. Планам прадугледжана ў 1940 годзе атрымаць прыбытку 358 тысяч рублёў, а фактычна за 8 месяцаў фабрыка мае 391 тысячу руб. прыбытку.

Дзяржава праяўляе вялікія клопаты аб добрабыце працоўных. На фабрыцы раней не было ніякай аховы працы, не было ўмоў для работы. Зараз на тэхніку бяспечнасці затрачаны тысячы рублёў, уцеплены цэхі, у якіх устаноўлены душавыя ванны.

Пабудаван клуб, у яго імкнецца стацыянарны кінатэатр. Два разы ў тыдзень тут дэманструюцца лепшыя кінофільмы. Пры клубе маецца бібліятэка з тысячай тамоў кніг. Рабочыя выпісваюць больш 150 газет. Маецца свая сталовая, шавецкая майстэрня і ларок.

Пасля стаханаўскай работы на прадпрыемстве рабочыя збіраюцца ў свой клуб, дзе прымаюць удзел у гуртках самадзейнасці і абаронных гуртках. Ужо здалі нормы на значок ГОА 20 чалавек, на [illegible] ПХА 38 чалавек.

[illegible] праца з падзявольнага [illegible] пры капіталізме ператварылася ў справу часці, доблесці, геройства пры совецкай уладзе.

А. С. Гушкаў,
загадчык сектарам агітацыі абкома КП(б)Б.

Танцы сялян Лібаўскага павета (Латвійская ССР)

Фота Ф. Кіслова *Фота ТАСС.*

Расце прадукцыйнасць працы

Дастойна рыхтуюцца да вялікага ўсенароднага свята—XXIII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі — рабочыя і служачыя Брэсцкай таварнай прыстані Заходняга рачнога пароходства. З часу работы прыстані, пароходамі дастаўлена ў раёны абласці 850 тон солі, каля 3 тысяч тон нафты. Перавезена каля 4 тысяч тон хлеба, звыш 4 тысяч кубаметраў лесаматэрыялаў. З месяца ў месяц выконваецца і перавыконваецца план пагрузкі і разгрузкі. Напрыклад, за верасень план выкананы на [illegible] процантаў, за 24 дні кастрычніка план перавыкананы на 580 тон.

Узоры стаханаўскай работы паказваюць брыгады рабочых грузчыкаў. З 10 маючыхся брыгад 9 сістэматычна перавыконваюць план. Брыгада тав. Данілюк Васіля з 16 да 24 кастрычніка выканала план на 288 процантаў, брыгада тав. Соль Якава выканала план на 205 процантаў. Выключна добра работае і жаночая брыгада пад кіраўніцтвам тав. Барысюк Тацяны. Яна выканала план на 222 процанты.

Для таго, каб стварыць яшчэ лепшыя ўмовы для стаханаўскай работы, адміністрацыя прыстані будуе жылы дом на 200 чалавек для стаханаўцаў, рабочых. Дом будзе гатоў да дня вялікага свята. У ім прадугледжан чырвоны куток з мяккай мэбляй, радыёпрыёмнікам. Адміністрацыя прыстані разам з рабочымі вядзе работу па афармленню калоны, якая будзе ўдзельнічаць у кастрычніцкай дэманстрацыі. Рыхтуецца макет парахода. Ён будзе размешчан на аўтамашыне, уперадзе калоны.

В. Паўлевіч.

Вёска ля Днепра-Бугскага канала

За Антопалем у ста метрах ад Днепра-Бугскага канала раскінулася невялікая вёска Яміні. Гэту назву вёска носіць каля сотні год. Пан Аржэшкі яшчэ да адмены прыгоннага права выслаў сюды двух сялян пасвіць памешчыкую жывёлу. З цягам часу тут утварылася вёска з 32 гаспадарак. На працягу ўсёй гісторыі існавання вёскі, сяляне былі залежнымі ад памешчыкаў.

У апошнія дзесяць год, перад прыходам Чырвонай Арміі, вёска вусіх не пашыралася. Дзесяткі маладых сялянскіх хлапцоў і дзяўчат, ганімыя беззямеллем, уцякалі ў гарады і ў маёнткі шукаць работы. У вёсцы не было школы і большасць сялянскіх дзяцей заставалася непісьменнымі.

Пасля прыходу Чырвонай Арміі ўзнавілася жыццё Яміні. Совецкая ўлада выправіла векавую несправядлівасць — былыя памешчыцкія землі сталі ўласнасцю народа. Сапраўдныя гаспадары зямлі з энтузіязмам узяліся за работу.

Першага верасня 1940 года ў Яміні адкрыта пачатковая школа, у якой дзеці сялян навучаюцца на роднай мове. Вечарам, пасля работы, за вучнёўскімі скамейкамі можна бачыць пажылых сялян і сялянак, ліквідуючых сваю непісьменнасць.

Мяняецца і знешні выгляд вёскі. У ваколіцы пастаўлена вялікая арка, упрыгожаная кветкамі і партрэтамі правадыроў. Многія сяляне будуюць новыя, вялікія і светлыя дамы, замест ранейшых зямлянак.

Каля вёскі прапакае Днепра-Бугскі канал — дзецішча вызваленага народа. Жыхары вёскі Яміні гапарацца тым, што ў гэтым вялікім збудаванні ёсць і частка іх працы.

Няма ўжо больш старой вёскі Яміні, ад яе засталася толькі назва. Тут жывуць зараз свабодныя і радасныя грамадзяне краіны Совецкаў.

Ф. Карпінскі,
загадчык Яміцкай пачатковай школы.

ТУРКМЕНСКАЯ ССР

Наша радзіма

Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка, займаючая 443,6 тысячы квадратных кілометраў, размешчана к усходу ад Каспійскага мора. На паўдзённым усходзе Туркменіі праходзіць дзяржаўная граніца СССР з Іранам і Афганістанам.

Па перапісу 1939 года, насельніцтва Туркменіі складае 1.203 985 чалавек.

Туркменію часта называюць „рэспублікай пустынь", так як каля чатырох пятых яе тэрыторыі займаюць пустыні, у тым ліку самая вялікая ў СССР пясчаная пустыня Кара-Кумы, што ў перакладзе на рускую мову азначае „Чорны пясок". Бязводзе—адрозніваючая рыса Туркменіі. У залоўнія яе раёны, у прыватнасці ў буйны порт Красаводск, вада для піцця прывозіцца на марскіх параходах з супрацьлеглага боку Каспійскага мора— з Баку.

Народ Туркменіі вядзе лютую барацьбу з прыродай за ваду, будуючы калодзежы ў пустыні, пракладваючы выдатныя падземныя тунелі для арашэння палёў, праводзячы каналы. З барацьбой за ваду звязана ўся гісторыя смелагалі[illegible]нага туркменскага народа. [illegible] Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі вадой, [illegible]й немагчыма тут жыццё. [illegible]гачы. Старая туркменская гаворыць: „Праца [illegible]ча працякае рака, [illegible] бедняка пралягае [illegible]. Пасля рэвалюцыі зямля [illegible] перайшлі ў рукі працоўных [illegible]ства. Совецкі ўрад дапамог [illegible]му арасіць [illegible]выя землі, устроіць калодзежы ў пустыні, дапамог туркменам-вандроўнікам асесці на зямлю і заняцца земляробствам, устойлівай жывёлагадоўляй.

У 1913 годзе пасевы бавоўны ў Туркменіі займалі ўсяго 69 тысяч гектараў. У 1937 годзе гэта плошча дасягнула ўжо 152 тысяч гектараў, гэта значыць павялічылася больш чым у два разы. Валавы збор бавоўны даў у 1913 годзе 52 тысячы тон, а ў 1939 годзе 241 тысячу тон.

У красавіку 1940 г. Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) прынялі пастанову аб развіцці сельскай гаспадаркі Туркменскай ССР. У гэтым рашэнні прадугледжаны велізарныя работы па абводненню пустыннай Туркменіі, у прыватнасці падачы вады ракі Аму-Дар'і на поўдзень ад Кара-Кумы. На работы па арашэнню будзе выдаткавана звыш чвэрці мільярда рублёў.

Туркменскія калгаснікі вырашчваюць доўгавалакністы бавоўнік, салодкі вінаград, пахучыя чарджоўскія дыні. Туркмены — таксама выдатныя жывёлаводы. На пяшчаных выпасах пустыні Кара-Кумы соўгасы і калгасы разводзяць каракулевых авец, скуркі ягнят якія цэняцца выключна высока. Туркменскія коні славяцца ва ўсім Совецкім Саюзе. На гэтых канях група туркмен-калгаснікаў у 1935 годзе зрабіла беспрыкладны конны пераход праз пустыні, стэпы і лясы — з Ашхабада ў Маскву.

Жанчыны Туркменіі ткуць каўры небачанай прыгожасці — лепшыя каўры ў свеце. На велізарных каўрах калгаснікі туркмені ткуць партрэты таварыша Сталіна, таварыша Молатава, карціны з жыцця туркменскага народа.

За гады сталінскіх пяцігодак Туркменская ССР стала прамысловай краінай. Совецкія вучоныя знайшлі ў нетрах Туркменіі аграмадныя багацці: нафту, вугаль, глаўберавую соль, калійную соль, серу, бром, ёд і др. На гэтых месцанараджэннях створана новая прамысловасць: нафтавыя прамыслы, Карабагазскі хімічны камбінат, серны завод у самым цэнтры пустыні Кара-Кумы (сувязь з ім ажыццяўляецца галоўным чынам самалётамі, нават частка вады прывозіцца па паветры) і др.

Да рэвалюцыі туркмены, як правіла, былі непісьменныя. Зараз у школах Туркменіі вучыцца звыш 200 тысяч дзяцей. У рэспубліцы створана 5 вышэйшых навуковых устаноў, 3а тэхнікумы. Туркменскі народ вылучыў буйных інжынераў-ірыгатараў, вучоных, стаханаўцаў бавоўняных палёў, каракулеводаў і др.

Сонечная Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка пакрываецца зеленню садоў і палёў, створаных стаханаўскай працай народа. Сталіца Туркменіі горад Ашхабад — была раней невялікім пыльным гарадком. Зараз гэта буйны, утапаючы ў зелені горад з насельніцтвам больш 125 тысяч жыхароў, прамысловы і культурны цэнтр Туркменскай ССР.

На вышыні 4.440 метраў

ФРУНЗЕ, 30 кастрычніка. (ТАСС) Сёння тут атрымана радыёпаведамленне ад групы альпіністаў, штурмуючых Безімянны пік кіргізскага Ала-Тау. Не гледзячы на неспрыяльнае надвор'е — жорсткі вецер са снегам, альпіністы ўчора вечарам узышлі на пік. У часе ўзыходжання яны праводзілі вучэбную стральбу, здавалі нормы на званне горнага Варашылаўскага стралка. На вышыні 4.440 метраў альпіністы ўстанавілі сцяг з надпісам „Фізкультурнікі Кіргізіі — у памяць Фрунзе."

У чэсць праслаўленага палкаводца быў дан трохразовы ружэйны салют. Вяршыні прысвоена імя Фрунзе.

204

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Міжнароднае жыццё азнаменавалася новай падзеяй — узнікненнем вайны паміж Італіяй і Грэцыяй. 28 кастрычніка раніцой італьянскі пасланнік у Афінах уручыў грэчаскаму ўраду ноту, патрабуючы за ультыматыўнай формай „прадаставіць італьянскім узброеным сілам права заняць некалькі стратэгічных пунктаў на тэрыторыі Грэцыі на час працягу сучаснай вайны з Англіяй". Грэчаскі ўрад адказаў адмовай. Грэчаскі прэм'ер Метаксас, па вестках Асошыэйтэд Прэс, заявіў таксама італьянскаму пасланніку, што ён разглядзвае прад'яўленую яму патрабаванні і „могад. прымянёны Італіяй, як аб'яву вайны".

Адначасова грэчаскі ўрад звярнуўся за дапамогай да Англіі. Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на весткі з аўтарытэтных кругоў, паведамляе, што Англія намерана задаволіць гэту просьбу і што Грэцыя можа разглядзвацца як саюзніца Вялікабрытаніі. Фактычна англійскія ўзброеныя сілы прынялі ўжо ўдзел у пачаўшыхся ў той-жа дзень — 28 кастрычніка — баявых сутычках.

Неабходна хоць коротка азнаёміцца з Грэцыяй.

Гэта невялікая гарыстая краіна, размешчаная ў паўднёвай частцы Балканскага паўвострава. У саставе яе тэрыторыі ўваходзяць таксама шматлікія астравы ў Эгейскім і Іанічным морах, якія амываюць Грэцыю і прадстаўляюць быццам вялікія залівы Міжземнага мора. Насельніцтва Грэцыі ўсяго 7,1 мільёна чалавек. Натуральныя рэсурсы краіны, як падглебавыя, так і расліннасці, нязначны. Прамысловасць развіта слаба. Узброеныя сілы Грэцыі складваюцца ў мірны час 90 тысяч чалавек, могуць быць даведзены да поўмільёна. Натуральныя ўмовы (горы) абцяжаюць абарону сухаземных граніц і [illegible], якія да гэтага-ж за апошнія гады былі ўмацаваны збудаваннем так званай „лініі Метаксаса", налічваючай да 3 тысяч доўгачасовых агнявых точак.

Роля Грэцыі ў міжнародных [illegible] значэнне стратэгічнае і яе геаграфічнага ста[illegible] тэрыторыя Грэцыі, лічачы [illegible] вы, прадстаўляе б. цыцам [illegible] кінуты ад Бал[illegible] няга Усходу.

[illegible] ўгія астравы

[illegible] становішча на [illegible] Суэцкага канала, [illegible] тыны, Турцыі. Востраў [illegible] ць ля самага ўваходу ў Адрыятычнае мора, прыкрываючы з флангаў водныя шляхі, злучаючыя Італію з Албаніяй. Такія парты, як Пірэй (блізь Афін) або Салонікі, валодаюць добра абароненымі гаванямі і забяспечваюць базіруючамуся на іх флоту спрыяючыя ўмовы для аперацый у зоне ўсяго ўсходняга Міжземнага мора. Пералічаныя вышэй парты і астравы, па думцы замежнага друку, і будуць галоўным аб'ектам барацьбы [illegible] паміж Італіяй і падтрымліваючы[illegible] Грэцыю Англіяй.

* * *

Германская авіяцыя працягвае налёты на Англію, таксама як і англійская на Германію. Камандуючы англійскай паўднёвай арміяй адмірал Окінлек заявіў нядаўна, што небяспека ўтварэння германскіх войск у Англію ні ў якім разе не мінавала. Адзак, побач з гэтым, намецкія публіцысты пішуць, што ўдар па Англіі не абавязкова нанесіць на Брытанскіх астравах, што яго можна нанесці і на Міжземным моры. У Міжземнаморскім басейне і чакаюць зараз, як піша замежны друк, найбольш інтэнсіўнага развіцця падзей.

Да гэтага часу адзінным сухаземным фронтам на берагах Міжземнага мора быў егіпецкі, дакладней фронт у палосе граніцы, паміж Лівіяй і Егіптам, дзе, па сцвярджэнню італьянскага друку, італьянскае камандаванне ўжо закончыла падрыхтоўку да аднаўлення вялікага наступлення.

„Наступленне гэта, — пісаў лонданскі „Таймс", — разлічана на ізаляцыю і разбурэнне апорных баз англійскага флота і армій на Міжземным моры, у Егіпце і ў Палестыне. Наступленне з Лівіі атрымае дзейную падтрымку з паветра, і, відавочна, будзе суправаджацца нападзеннем на Хартум (у Судане) і, магчыма, таксама яшчэ больш глыбокім пранікненнем у Кенію".

Англійская прэса даўно ўжо ўказвала, што пры гэтых умовах працяўнік, відавочна, спрабуе падмацаваць сваё наступленне з Лівіі радам другіх удараў.

У гэтай сувязі замежны друк зазначае таксама ўзмоцненую дыпламатычную актыўнасць важнейшых дзяржаў міжземнаморскіх і сумежных з імі краін.

23 кастрычніка Гітлер у суправаджэнні германскага міністра замежных спраў Рыбентропа і прадстаўнікоў вярхоўнага германскага камандавання прыбыў на франка-іспанскую граніцу, дзе адбылася сустрэча паміж ім і ген. Франко. На наступны дзень, знаходзячыся ва Францыі, Гітлер прыняў маршала Петэна, а за два дні да гэтага, глава германскай дзяржавы меў гутарку з намеснікам французскага прэм'ера Лавалем. Значэнне гэтых дыпламатычных сустрэч падкрэсліваецца тым фактам, што на-днях Лаваль назначан французскім міністрам замежных спраў. Адначасова з гэтымі сустрэчамі ў савецкім друку паявіліся весткі аб праекце часовага (да заключэння міру) пагаднення паміж Германіяй і Францыяй. Па паведамленню амерыканскага тэлеграфнага агенцтва Асошыэйтэд Прэс, гэты праект прадугледжвае частковае ачышчэнне нямецкімі войскамі акупіраванай імі зоны ва Францыі. Граніца акупіраванай зоны перасоўваецца на поўнач на лінію рэкі Сены. Паўднёвая і паўднёва-заходняя часткі Парыжа павінны такім чынам перайсці пад кантроль урада маршала Петэна. Германія вызваляе таксама французскіх палонных. Урад Петэна ў сваю чаргу прадастаўляе Германіі французскія ваенна-марскія базы ў Тулоне (на поўдні Францыі), у Дакары (у Заходняй Афрыцы), у Бізерце (Туніс), у Касаблянцы (Мароко), а таксама французскія ваенныя базы ў Паўночнай Афрыцы і Сірыі. Пры гэтым абарона пералічаных баз па-ранейшаму ўскладваецца на абараняючыя іх зараз сілы французскага флота.

У сучасны момант гэты праект абмяркоўваецца французскім урадам. Хоць вёсткі, што некаторыя члены цяперашняга французскага кабінета гатовы былі-б падпісаць пагадненне, ідучае нават далей выкладзенага вышэй праекта — аж да аб'явы Францыяй вайны сваёй нядаўняй саюзніцы Англіі. Амерыканскі друк адзначае, што ў асяроддзі цяперашніх правіцеляў Францыі далёка няма адзінства ў гэтым пытанні. Рад паведамленняў з Францыі пацвярджае наяўнасць унутранай барацьбы ў кіруючых кругах Францыі.

Прэзідэнт ЗША Рузвельт, відома, палічыў неабходным з[illegible] нуцца да маршала Петэна з [illegible] цыяльным [illegible]ланнем, у якім па вестках англійскай і амерыканскай прэсы, папярэджвае, што ЗША не аказ[illegible]уць ніякай дапамогі Францыі, калі апошняя будзе супрацоўнічаць з Германіяй. Рузвельт папярэджвае таксама, што ў выпадку такога супрацоўніцтва амерыканская рэспубліка акупіруюць французскія калоніі ў Вест-Індыі.

Адносіны паміж Англіяй і ЗША з'яўляюцца вельмі істотным фактарам міжнароднай сітуацыі. Вашынгтонскі карэспандэнт амерыканскага газетнага трэста Скрыпс Говард Дэні характарызуе гэтыя адносіны так: „Англа-амерыканскае супрацоўніцтва, — піша ён, — ужо ўключае сумесныя дзеянні штабаў ваенна-марскіх флотаў абедзух краін, абмен сакрэтнымі ваеннымі і разведвальнымі весткамі, а таксама цеснае супрацоўніцтва на эканамічным і дыпламатычным франтах". У гэтай сувязі цікава напомніць паведамленне амерыканскага журнала „Ньюсуік" аб тым, што урад ЗША дазволіў Англіі закупіць у Злучаных Штатах сакрэтныя амерыканскія прыцэлы для бамбардыровачнай авіяцыі. Па вестках „Нью-Йорк тэлеграм", 80 процантаў усёй вытворчасці самалётаў у ЗША зараз адпраўляецца ў Англію. Англійскі пасол у Вашынгтоне лорд Лоціан, нядаўна прыбыўшы з ЗША у Лондан, заявіў, што амерыканскія самалёты паступаюць у сучасны момант у Англію сотнямі.

Брытанскі ўрад і камандаванне вядуць зараз у Міжземнаморскім басейне дзейную ваенную і ваенна-дыпламатычную падрыхтоўку да прадстаячых падзей.

Саставу міжземнаморскай англійскай эскадры папоўнен. У Егіпет прыбываюць новыя падмацаванні з Метраполіі і з брытанскіх уладанняў на Усходзе. У гэтай сувязі можна напомніць хоць-бы паведамленні аб окапленні англійскіх транспартных суднаў на востраве Цейлоне і нядаўнюю опробу італьянскіх мінаносцаў атакаваць англійскія транспарты ў Красным моры. Нядаўні бой паблізу Сіцыліі, калі некалькі італьянскіх эсмінцаў было патоплена агнём брытанскіх крэйсераў, паказвае, што марскія камунікацыі італьянскай арміі ў Лівіі лёгка могуць аказацца пад сур'ёзнай пагрозай разрыву.

Савецкая прэса прыдае велізарнае значэнне візіту англійскага ваеннага міністра Ідэна ў Егіпет: „У Егіпце, — піша лонданская „Дэйлі тэлеграф", — Ідэн уступіць займецца пытаннем аб італьянскім фактары ў праблеме вайны... У Каіры ён будзе мець магчымасць грунтоўна абмеркаваць шматлікія праблемы". Па вестках замежнага друку, гутаркі Ідэна з егіпецкім каралём Фарукам павінны ўдакладніць пазіцыі Егіпта. Каірскі карэспандэнт „Нью-Йорк кронікл" паведамляе аб заключэнні пагаднення адносна фінансіравання Англіяй абаронных мерапрыемстваў Егіпта.

* * *

17 кастрычніка пасля трохмесячнага перарыва адновілася перакідка ваенных грузаў па дарозе Бірма-Кітай. Не гледзячы на налёты японскай бамбардыровачнай авіяцыі, дарога функцыянірує. 16 кастрычніка ўступіла ў сілу ўведзенае ў ЗША эмбарго (забарона) на вываз жалезнага лома ў Японію. Эмбарго на вываз высокаякаснага бензіна, абсталявання для вытворчасці гэтага бензіна, як вядома, дзейнічае ўжо на працягу доўгага часу. У перагаворах з уладамі Галандскай Індыі японская эканамічная дэлегацыя аказала, [illegible] словах амерыканскага дру[illegible] умоцненае дауленне на ся[illegible] контрагентаў, дабіва[illegible] [illegible]нення аб снабжэнні Японіі [illegible]йным бензінам і разрыва [illegible]таў адносна паставак [illegible]нага [illegible] з Галандскай Індыі ў Англію. [illegible] разлічвала, такім чынам, [illegible] часткова паралізаваць уплыў заваёўненых мерапрыемстваў урада ЗША. Аднак пакуль што гэта не ўдалося. Па апошніх вестках, перагаворы паміж Японіяй і Галандскай Індыяй спынены, і глава японскай дэлегацыі Кобаасі выехаў з Батавіі (на востраве Ява) у Токіо.

У Індыі-Кітаі канцэнтрацыя японскіх войск працягваецца. Паступаюць паведамленні аб прыбыцці усё новых і новых атрадаў, роўна як і аб новых японскіх патрабаваннях. У сваю чаргу, усё больш схільны да японскай арыентацыі урад Таі (Сіам) прад'яўляе тыя ці іншыя тэрытарыяльныя патрабаванні ўладам Індыі-Кітая. На граніцы паміж Таі і Індыі-Кітаем сітуацыя становіцца усё больш напружанай. Пасланнік ЗША ў Таі заявіў, што Злучаныя Штаты супярэчаць супроць якога-б то ні было змянення зараз існуючых граніц у басейне Ціхага акіяна.

Злучаныя Штаты працягваюць ускоранымі тэмпамі ўзмацняць свае ўзбраенні на Гавайскіх астравах і на Філіпінах. Марскі міністр ЗША Нокс, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў друку, ці намераны Злучаныя Штаты сілай абараняць Філіпіны, заявіў, што амерыканскі марскі флот будзе абараняць усе амерыканскія ўладанні.

І. Мікусон.

Англа-італьянская вайна

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што 29 кастрычніка англійская авіяцыя бамбардыравала ў Афрыцы Дэрна, Домба, Эль Гімі, Эль Газала, Эль Губі, Тобрук, Эль Эддем і Солум.

У Дэрна прычынены значныя страты. У Эль Газала ўспыхнулі 2 вялікіх пажары. У Тобруку пашкоджаны ваенна-марскія казармы. У Эль Губі знішчан адзін будынак. У Солуме ўспыхнуў вялікі пажар на пасадачнай пляцоўцы. У Менастыры бомбы былі скінуты на непрыяцельскія самалёты, якія стаялі на зямлі.

Учора англійская авіяцыя бамбардыравала Асаб (Эрытрэя). Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы.

РЫМ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе, што ва Ўсходняй Афрыцы механізаваная калона працяўніка, якая рухалася да Гадура (на граніцы з Кеніяй), была адбіта са стратамі для яе. У італьянцаў не было страт. Самалёты працяўніка бамбардыравалі Буне, Масада, Луг-Ферандзі (італь[illegible] Керэн (Абісінія) і Б[illegible] 5 забітых і 16 ра[illegible] 18 чалавек — туземцы. [illegible] налёты па Эль Уак[illegible] рэя) былі безрэзуль[illegible]

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе, што налёты на Лондан і ваенныя аб'екты ў Цэнтральнай і Заходняй Англіі працягваліся. Цяжка пашкоджаны авіяцыйны завод, фабрыка паблізу Шэфільда і адзін ваенны лагер. У 300 кілометрах на захад ад Ірландыі германскім самалётам патоплена гандлёвае судно працяўніка танажам у 5.000 тон.

Ноччу бамбардыроўкі Англіі прынялі больш шырокія маштабы. Былі заўважаны ўзрывы і пажары на прамысловых прадпрыемствах і доках па абедзвух старонах Тэмзы. Акрамя таго, паспяховай бамбардыроўцы падверглася парты на заходнім узбярэжжы Англіі і цэнтры ваеннай прамысловасці ў Цэнтральнай Англіі, галоўным чынам, у Ковентры.

Непрыяцельскія гандлёвыя катэры, скарыстаўшы туман спрабавалі наблізіцца да берага Фландрыі. Артылерыя германскага ваенна-марскога флота ўзяла гэтыя катэры пад эфектыўны абстрэл і прымусіла іх павярнуць назад. Адзін тарпедны катэр трэба лічыць патопленым.

У ноч на 31 кастрычніка англійскія самалёты ўпоў[illegible] [illegible]ся пад заходнімі пагранічнымі раёнамі Германіі і скінулі бомбы, якія, аднак, упалі ў поле і толькі пашкодзілі кабель высокага напружання. Працяўнік страціў учора 13 самалётаў. Германская авіяцыя страціла 5.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што дзеянні германскай авіяцыі ў ноч на 31 кастрычніка канцэнтраваліся, галоўным чынам, у раёне Лондана, а таксама Усходняй і Паўднёвай Англіі. Матэрыяльныя страты і колькасць афяр нязначныя. Учора англійская авіяцыя страціла 5 знішчальнікаў.

Не гледзячы на непрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, англійская авіяцыя прадпрыняла ў ноч на 31 кастрычніка новыя налёты на розныя раёны Германіі, а таксама парты Ла-Манша, знаходзячыяся пад германскім кантролем.

Марокое міністэрства паведамляе, што тральшчыкі „Уэйвфлуэр" і „Джозеф Беттэн" былі патоплены непрыяцельскімі мінамі. Акрамя таго, патоплен параход „Оен Мало", які належыў раней Францыі, а ў апошні час знаходзіўся ў саставе канадскага флота. 28 членаў каманды загінулі без весткі, 16 — высаджаліся ў Англіі.

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). 29 кастрычніка італьянскія самалёты ўпершыню ўдзельнічалі ў масавым дзённым налёце на Англію. Па словах газет, адно злучэнне з 5 італьянскіх бамбардыроўшчыкаў лятала ў суправаджэнні не менш ста знішчальнікаў „Мессершміт". Англійская зенітная артылерыя адагнала іх яшчэ да таго, як яны пасцелі працяўніку углыб краіны. Другія злучэнні, таксама з 5 машын, паляцелі ў суправаджэнні 150 самалётаў тыпа „Капроні" і знішчальнікаў. Англійскія знішчальнікі збілі 2 непрыяцельскіх самалёты.

Становішча ў Гібралтары

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Ваенна-марскія ўлады Гібралтара паведамілі, што учора раніцой італьянскія марскія афіцэры зрабілі спробу тарпедыраваць з дапамогай спецыяльнага механізма караблі ў парту Гібралтара. Адна з тарпед узарвалася, не прычыніўшы страт, другая была выкінута на Іспанскую тэрыторыю паблізу Ла-Лінеа. Тарпеда не ўзарвалася і мінулай ноччу была перавезена на грузавіку ў Алхесірас.

Як перадае агенцтва Рэйтэр, абарона Гібралтара значна ўзмоцнена зараз вялікай колькасцю гармат, якія ахоўваюць усе подступы з зямлі і мора.

Прадстаячае ўвядзенне картачак у Балгарыі

САФІЯ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Балгарскі міністр гандлю і прамысловасці Загораў заявіў прадстаўнікам друку, што балгарскі ўрад рашыў правесці падрыхтоўчыя мерапрыемствы да ўвядзення картачак на прадметы першай неабходнасці. Дырэктыўнай статыстыкі будзе зроблен спецыяльны перапіс насельніцтва, на аснове чаго будуць загатоўлены і разданы насельніцтву харчовыя картачкі. У мясцовасцях з насельніцтвам менш 5.000 чалавек картачкі рашана не выдаваць, а рабіць размеркаванне прадуктаў па спісах.

З ленты тэлеграфа

Шведскім парламентам прыняты ўрадавы законапраект аб водпуску 28 мільёнаў крон на патрэбы абароны, у прыватнасці, на будаўніцтва ангараў, складаў боепрыпасаў і аэрадромаў.

* * *

Балгарскі ўрад абавязаў усіх домаўладальнікаў падрыхтаваць сховішчы для супрацьпаветранай абароны ў сувязі з прадстаячымі ў лістападзе вучэннямі па супрацьпаветранай абароне.

* * *

У Румыніі ў гэтым [illegible]дзе сабрана ўсяго 20 процантаў нармальнага ўраджаю бавоўны.

* * *

Амерыканскі параход даставіў з Лісабона ў Нью-Йорк належачае партугальскаму банку золата на суму 2.700 тысяч долараў.

* * *

Змешаная балгара-румынская камісія па перасяленню балгар з Паўночнай Добруджы ўстанавіла канчатковы парадак перасялення. Усяго будзе перасялена каля 54 тысяч чалавек.

* * *

Экспартна-імпартны банк ЗША адобрыў прадастаўленне Бразіліі пазыкі ў 25 мільёнаў долараў для крэдытавання бразільскіх закупак у ЗША.

* * *

У Стакгольме, Мальмё і Гётэборгу (Швецыя) на тэлефонных станцыях мантыруюцца [illegible]льныя устаноўкі, дзя[illegible] якім паветраная трывога мо[illegible] аб'яўлена адначасова [illegible]

Італьянскія паведамленні

РЫМ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе, што 29 кастрычніка днём італьянская авіяцыя без страт для сябе бамбардыравала ў Паўднёвай Англіі намечаныя аб'екты, прычыніўшы працяўніку цяжкія страты.

Ваенныя дзеянні паміж Грэцыяй і Італіяй

НЬЮ-ЙОРК, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэчаскі генеральны штаб паведамляе, што грэчаскія войскі стрымліваюць працяўніка пасля „незначнага адступлення" з перадавых сектараў на фронце ў правінцыі Эпір. На другіх франтах — заціішша. Авіяцыя працяўніка падвергла беспарадачнай бамбардыроўцы і абстрэлу з кулямётаў горад Патры. Акрамя таго, былі бамбардыраваны невялікія аб'екты ў Навпактосе. Адзін чалавек забіт і 5 ранена. Разбурана школа ў Навпактосе і некалькі дамоў у Патры.

АФІНЫ, 31-га кастрычніка. (ТАСС). Учора ў 16 гадзін 20 мінут у Афінах і Пірэі была аб'яўлена паветраная трывога.

РЫМ, 31 кастрычніка. (ТАСС). У зводцы італьянскага камандавання паведамляецца:

„Нашы часці, працягваючы прасоўванне, дасягнулі некалькіх пунктаў рэкі Каламас (у Грэцыі). Не гледзячы на непрыяючыя ўмовы надвор'я і перашкоды створаныя адступаючым працяўнікам, рух нашых войск не замарудзіўся.

Наша авіяцыя, не гледзячы на цяжкія атмасферныя ўмовы і інтэнсіўны агонь зенітнай артылерыі працяўніка, бамбардыравала порт Патры. Пашкоджаны ваенныя транспарты працяўніка. Бамбардыроўцы падверглася таксама база Лепанто (Навпактос), барацьба грэчаскіх войск паблізу Мецовона важныя збудаванні і раёны скрыжавання дарог у даліне ракі Каламас. Збіт адзін самалёт працяўніка. Адзін з нашых самалётаў не вярнуўся".

Спыненне пропуску паездоў праз грэчаскую тэрыторыю

САФІЯ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Галоўная дырэкцыя чыгунак Балгарыі атрымала афіцыяльнае паведамленне грэчаскіх улад аб тым, што імі спынен пропуск праз грэчаскую тэрыторыю паездоў курсіруючых паміж Балгарыяй і Стамбулам. Паезды з Цэнтральнай Еўропы надалей будуць ісці толькі да Сафіі.

Мерапрыемствы грэчаскага ўрада

АФІНЫ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Грэчаскі ўрад прадпрыняў рад мер супроць стварэння запасаў прадуктаў. Кожная сям'я мае права запасацца прадуктамі толькі на адны суткі.

Адказны рэдактар Г. Т. Мінчукоў

ПАВЕДАМЛЕННЕ

2 лістапада ў 20 гадзін у памяшканні Дома партыйнай асветы адбудзецца

публічная платная ЛЕКЦЫЯ на тэму

„МАРКСІСЦКА-ФІЛАСОФСКІ МАТЭРЫЯЛІЗМ"

Лекцыю чытае дактар ЦК КП(б)Б тав. Амгінэй.

Цана білета 1 руб.

Білеты прадаюцца ў Доме партасветы і ў аддзеле прапаганды і агітацыі ГК КП(б)Б.

Аддзел прапаганды і агітацыі ГК КП(б)Б.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр імені Горкага

БАБЫ

Кінатэатр імені Горкага

„СВЕТЛЫ ШЛЯХ"

У гал. ролі заслужаны арт. рэспублікі, ордэнаносец Л. Орлова.

Штодзённа 4 сеансы.

Даводзіцца да ведама усіх будаўнічых і гаспадарчых арганізацый Брэсцкай вобласці, што

БРЭСЦКАЯ ПРАЕКТНА-КАШТАРЫСНАЯ ГРУПА БЕЛДЗЯРЖПРАЕКТА

прымае выкананне праектаў і каштарысаў на будаўнічыя і сантэхнічныя работы

па грамадзянскіх і прамысловых збудаваннях.

Для своечасовага афармлення тэхнічнай дакументацыі група Белдзяржпраекта прыступіла да прыёмкі заказаў на 1941 год.

Адрас: Брэст, вул. Дзержынскага 30, тэл. 7-40.

Белдзяржпраект

Сярэдняя школа № 12

патрабуюцца прыбіральшчыцы.

Звяртацца па адрасу: Праспект 17 верасня, 84

МЯНЯЮ КВАТЭРУ

з двух пакояў, размерам у 35 квадратных метраў, з усімі удобствамі, у цэнтры горада на роўнацэнную з трох пакояў.

З прапановамі звяртацца па тэлефону 7-44 з 9 да 12 дня.

Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт склікае

СЁННЯ 2 ЛІСТАПАДА

Усіх старшынь, намеснікаў, сакратароў і членаў акруговых камісій па выбарах

у Бр[illegible] [illegible]радскі Совет депутатаў працоўных з парадкам дня: [illegible] выбара[illegible] Брэсцкі гарадскі Совет депут[illegible]

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1 — 17, 1—23, 8—15.